УДК 80.161.3

# ЭПІТЭТЫ ПАВОДЛЕ СТЫЛІСТЫЧНАГА ЎЖЫВАННЯ І СТУПЕНІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ КАМПАНЕНТАЎ У ЗБОРНІКУ “ВЯНОК” М.БАГДАНОВІЧА

***А.Б. Хаменя, Ю.Р. Лукашэвіч,*** *11 клас*
*Навуковы кіраўнік –* ***Н.У. Магер,*** *настаўнік*
***Ліцэй УА “Палескі дзяржаўны ўніверсітэт”***

М.Багдановіч дасягае высокай паэтычнасці, вобразнасці пры дапамозе звычайных, агульнавядомых слоў і выразаў, якія ў паэтычным кантэксце рэалізуюць мнагазначнасць, стылістычную разнастайнасць.

З 94 вершаў зборніка метадам суцэльнай выбаркі быў адабраны эпітэты (281), якія былі размеркаваны па адпаведных тыпах.

Абраная класіфікацыя эпітэтаў мяркуе падзел мастацкіх азначэнняў па іх семантыка-стылістычнай прыналежнасці. У адпаведнасці з ёй выяўлены наступныя колькасныя суадносіны: агульнамоўныя (140), індывідуальна-аўтарскія(73), народна-паэтычныя (68).

ТАБЛІЦА 1

Тыпалогія эпітэта ў тэкстах зборніка “Вянок” М. Багдановіча

| № п/п | Эпітэты | Колькасць | Працэнтныя суадносіны |
|---|---|---|---|
| 1. | Агульнамоўныя | 140 | 49,8% |
| 2. | Сталыя | 73 | 26% |
| 3. | Індывідуальна-аўтарскія | 68 | 24,2% |

Як відаць са статыстычных дадзеных, самая вялікая група сярод разгледжаных эпітэтаў - агульнамоўныя, характэрнай прыметай якіх з’яўляецца адносна ўстойлівая сувязь з паяснёным словам, узнаўляльнасць, частая ўжывальнасць у літаратурнай мове. Сярод Багдановічавых агульнамоўных эпітэтаў сустракаюцца як стылістычна нейтральныя, так і эмацыянальна афарбаваныя, ужытыя з прамым і пераносным значэннем:

Кроплі слёз ці ***халоднай*** расы? “Чуеш гул?” [1, с. 20]

Стаяў калісь тут бор ***стары,***

І жыў лясун у тым бары. “Возера” [1, с.21]

… У ***цёмнай*** глыбіні хавае. “Возера” [1, с.20]

Ці ж загубіў плывучы сонЗ ***чырвоных*** макаў свой вянок? “Блішчыць у небе зор пасеў” [1, с.26]

Наступная па колькасці група народна-паэтычных (сталых, традыцыйных) эпітэтаў, таму што глыбокае веданне паэтычнай мовы вуснай народнай творчасці не можа не прывесці да шырокага выкарыстання яе вобразаў і багацця для перадачы аўтарскай задумы, надання творам яркай нацыянальнай афарбоўкі:

Як мары, ***белыя*** бярозыПад сінявой начной стаяць. “Зімой” [1, с.40]

Дык разлійся жа раздольна Ў ***чыстым*** полі і гаю “Перад паводкай” [1, с.41]

Выліў тугу і на вецер ***буйны*** кінуў.. “Уся ў слязах, дзяўчына” [1, с.48]

Асвяціла свечка з воску хлопца твар ***васковы***. “Ян і маці” [1, с. 49]

Апавядае тут. Як ***рупная*** пчала Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак. “Летапісец” [1, с.51]

***Чыстая, сцюдзёная*** вадзіца. Ты цячэш балотамі, імхамі, “Ціхі вечар” [1, с. 58]

Значнасць мастацкага твора залежыць ад маштабу асобы яго стваральніка. Чым большы яго талент, чым ярчэй выяўлена яго індывідуальнасць, тым больш фантастычная намаляваная ім карціна жыцця. Індывідуальна-аўтарскія (аказіянальныя) эпітэты вызначае самабытнасць аўтарскага ўжывання. Яны адлюстроўваюць тое, як пісьменнік асэнсоўвае рэчаіснасць. Такія вобразныя азначэнні надзвычай рэдка спалучаюцца з аднымі і тымі ж словамі; яны адзінкавыя. Важная роля пры стварэнні такіх мастацкіх азначэнняў належыць своеасаблівасці аўтарскіх асацыяцый, непаўторнасці свету ў паэтавых вачах. Якасці або ўласцівасці прадмету ці з’яве надае аўтар, пераносячы іх са свайго, толькі яму аднаму падуладнага свету. У выніку ствараецца непаўторны зрокавы, слыхавы, абаняльны вобраз:

У небе зоркі ад марозу ***Пахаладзеўшыя*** дрыжаць. “Зімой” [1, с.40]

***Вільготны*** месяц стуль на поле празрысты, светлы стоўп спусціў. “Зімой” [1, с.40]

***Ціхім*** каханнем к табе разгарацца З гэтай пары я пачаў. “Раманс” [1, с.45]

Раскрыццё духоўнага свету лірычнага героя, як правіла, адбываецца праз матэрыяльныя вобразы, карціны прыроды. Для гэтага Багдановіч карыстаецца побач з агульнамоўнымі і сталымі індывідуальна-аўтарскімі эпітэтамі, якія выражаюць аўтарскую ацэнку навакольнага жыцця, дапамагаюць нам бачыць свет у складанай прызме асацыяцый, знаходзіць падабенства і выяўляць аналогіі, якія даюць магчымаець зразумець нябачныя на першы погляд сувязі паміж разнастайнымі з'явамі. Сваёй семантыкай, гукавой формай прыметнікі выклікаюць у чалавека пэўныя асацыяцыі, удакладняюць і паглыбляюць характарыстыку аб’ектаў рэчаіснасці.

Праведзенае даследаванне эпітэтаў, якія функцыянуюць у тэкстах твораў М.Багдановіча, паказала іх вялікую значнасць, багаты экспрэсіўна-семантычны патэнцыял і разнастатнасць па лініях семантыка-стылістычнай і марфалагічнай тыпалогіі.

Мы можам зрабіць вывад, што самая шматлікая група прадстаўлена агульнмоўнымі эпітэтамі, сталыя і індывідуальна-аўтарскія прадстаўлены ў прыблізна роўных суадноінах. Колькасны аб’ём суадносін дэманструе наступная дыяграма:




## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Багдановіч М: Венок. Книга избранных стихотворений. Факсимильное издание, – Мінск, Мастацкая літаратура, 1985. – 122 с.

2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл; Пад рэд. А.Я.Міхневіча. – М., 1954

3. Томашевский, Б.В. Теория литературы. Поэтика / Б.В. Томашевский, – Москва, 1999.